# Традыцыямі моцныя

**СУМЕСНАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ ВЫХАВАЛЬНІКАЎ І БАЦЬКОЎ
ПА РАЗВІЦЦІ НАРОДНЫХ ПЕДАГАГІЧНЫХ ТРАДЫЦЫЙ**



На працягу стагоддзяў народная педагогіка была амаль адзіным сродкам выхавання людзей. Яна стварыла адпаведны  асобы - працавітай, шчырай, сумленнай, добразычлівай, гуманнай, гасціннай і вд.

Засваенне дзецьмі дашкольнага ўзросту духоўна-матэрыяльнай спадчыны, фарміраванне ў іх нацыянальнай самасвядомасці, сцвярджэнне сваёй культурнай ідэнтычнасці і непаўторнасці становіцца вызначальнай праблемай у нашым жыцці. Педагогі і бацькі мусяць актыўна супрацьстаяць такому негатыўнаму працэсу, як знікненне каштоўных народных традыцый, і мэтана кіравана шукаць шляхі захавання і адраджэння страчаных скарбаў.

Прызнанне прыярытэту этнакультуры і агульна чалавечых каштоўнасцей патрабуе пошуку новых спосабаў і магчымасцей уключэння ў гэтую галіну маленькага дзіцяці ў перыяд фарміравання яго духоўнага свету.

Аснова творным у народнай педагогіцы беларусаў было выхаванне на прынцыпах гуманізацыі і прырода згоднасці. Спазнаваць унікальны пласт матэрыяльных і духоўных каштоўнасцей, што змяшчае магутны выхаваўчы патэнцыял, і давядзецца сем'ям дашкольнай установы, дзеці з якіх наведваюць беларускамоўныя групы.

Самае першае самавыяўленне народнай душы адлюстраванаў мове вуснай народнай творчасці. Каларытныя словы і выразы растлумачваюць дзіцяці жыццё грамады, свет чалавечых пачуццяў, узбагачаюць эмоцыі. У фальклоры ўтрымліваецца сацыяльны вопыт нацыі, які перадаецца ад пакалення да пакалення праз вуснае паэтычнае слова. У раннім узросце эмацыянальная сувязь малых з бацькамі фарміруецца шматлікімі сродкамі: як ласкавымі, пяшчотнымі словам! *Міхасёк, Змітрок, Юрасік, ластавачкамая, пацягушэнь цпарастушэнькі,* так і гульнямі (кранаючы ручкі, ножкі дзяцей). Гэта дазваляе гаварыць пра існаванне своеасаблівай «школы пешчання» немаўлятаў, якія яшчэ толькі пачынаюць развівацца і ў якіх зараджаецца сэнсаванае разумение навакольнага асяроддзя. Гэта дапамагае, па-першае, фарміраванню нервовай сістэмы, што вельмі важна для далейшага развіцця асобы, па-другое, у дзіцяці выхоўваюцца добразычлівыя, ветлівыя, мяккія адносіны да людзей. Таму лічым неабходным арганізаваць бацькоў у своеасаблівую суполку, правесці бацькоўскія сходы, каб сем'і атрымалі асноўныя веды і навыкі, неабходныя ўжыцці іх дзіцяці малодшага ўзросту і наладзілі трывалыя сувязі з выхавальнікамі.

У дзіцячым садзе з рускай мовай навучання менавіта ад выхавальніка залежыць, як часта будзе гучаць беларуская мова ў штодзённым жыцці: гэта станоўча ўплывае на засваенне дзецьмі беларускай мовы на пачуццёвым узроўні. Можна прапанаваць бацькам купіць кнігу на беларускай мове і праводзіць гутарку, а потым дзеці па чарзе будуць расказваць, як чыталі яе дома. Але нішто не параўнаеш з жаданнем запомніць новае слова, яскравы паэтычны радок, падзяліцца радасцю свайго адкрыцця з бацькамі. Чым беларускія калыханкі адрозніваюцца ад рускамоўных? Толькі адзін прыклад: «...Придёт серенький волчок и укусит за бочок».

Ці магчыма заснуць пасля такіх слоў?! А вось зусім іншы аспект — варыянт «Калыханка зайку»:

Белы-белы камячок,
Павярніся на бачок,
У сняжок зарыйся,
Лапкаю накрыйся.
Буду сон твой берагчы
Ад сабачкі злога.
Вы не рушце ў начы
Зайчыка малога.

Строгасць і патрабавальнасць да дзяцей былі традыцыйнай нормай беларусаў. Трэба адзначыць, што народная мараль асуджала рэзкасць і жорсткасць ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей. І тут таксама, на наш погляд, у выхаванні дзейнічае прынцып гуманізму і адпаведнасці прыродзе. Аднак, характарызуючы розныя сітуацыі і стаўленне бацькоў да ўчынкаў дзяцей, мы вырашылі пераканаць першых у неабходнасці выканання таго або іншага дзеяння, а таксама выкарыстання розных метадаў і прыёмаў выкаранення шкодных звычак, непажаданых праяваў дзяцей 5-6-ці гадоў. Добрыя звычаі, якія якраз замацоўваюцца да 6-ці гадоў лепш за ўсё фарміруюцца шляхам пераймання. Менавіта з фальклорных твораў дзеці атрымліваюць простыя і разам з тым найбольш важныя для жыцця веды аб узаемаадносінах чалавека з навакольным светам, вучацца любіць працу, тлумачыць прыроду рэчаў, развіваюць знаходлівасць, уменне пераадольваць цяжкасці.

У традыцыі беларускага народа клопат пра сямейны гонар, гонар свайго роду лічыўся пачэснай справай. Гэтаму служаць павага, любоў да сям'і, прызнанне заслуг родных і блізкіх, знаёмства з генеалагічным дрэвам роду — радаводам, захаванне сямейных архіваў і рэліквій, расказы і ўспаміны старэйшых. З маленства дзіця прывучалі да думкі, што яно — непарыўная частка сям'і. Простаму беларусу, каб карыстацца павагай, трэба было ведаць пра свой род да сёмага калена.

## **Па святочныхшляхах Беларусі…**

Народны каляндар — гэта ўпарадкаваны гадавы рытм працоўнага і духоўнага жыцця чалавека. Народный святы як адлюстраванне нацыянальнай традыцыі акумулююць спрадвечныя звычаі і абрады І тым самым выхоўваюць дзіця шляхам прымання ім каштоўнаснага ідэалу роднай культуры.

Размовы пра выяўленне зносінаў выконваюць важную ролю ў наладжванні кантакту, узаемадзеяння дзяцей паміж сабой і ўсімі членамі сям'і. Гэта ўплывае не толькі на развіццё ўспрымання навакольнага свету, але і на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці дашкольнікаў сродкамі жывога вуснага слова і пазітыўнага патэнцыялу народнай гульні.

Свята - гэта час мірных і цёплых узаемаадносінаў дзяцей і дарослых, калі збіраліся ўсёй сям'ёй, слухалі дзівосныя гісторыі дарослых, гулялі ў розныя гульні, загадвалі загадкі, пелі, скакалі, ласаваліся прысмакамі.

Па гэтым прынцыпе на працягу навучальнага года арганізоўваюцца святы (паводле беларускага народнага календара), дзе актыўны ўдзел прымаюць нетолькі дзеці, але і бацькі вахаванцаў і, што каштоўна ўдвая, іх дзядулі і бабулі. Гэтыя святы праводзяцца ў беларускамоўнай групе ў наступным парадку:

*верасень* — **Дажынкі** (фальклорнае свята); *кастрычнік* — **Багач** (фальклорнае свята); *лістапад* — **Кірмаш** (музычна-тэатралізаванае дзейства); *снежань* — **Вячоркі** (сямейна-абрадавая сцэна); *студзень* — **«Едзе Каляда ў чырвоным вазочку»** (карнавальна-тэатралізаванае дзейства); *люты* — **Вясёлая масленіца** (фальклорнае свята); *сакавік* — **Гуканне вясны**. **Саракі**: **«Жавароначкі, прыляціце»** (фальклорнае свята); *красавік* — **Свята прылёту буслоў** (фальклорна-фізкультурнае ігрышча); *май* — **«Ідзе, ідзе карагод...»** (музычна-гульнявое спаборніцтва).

Скарыстанне вопыту народнай педагогікі ў выхаванні дзяцей дае вельмі станоўчы эфект тады, калі бацькі і педагогі наладжваюць працу на аснове каляндарнай абраднасці беларусаў. Абрады з'яўляюцца састаўной часткай традыцыйна-побытавай культуры народа, замацоўваюць адносіны людзей паміж сабою, іх паводзіны ў важных жыццёвых сітуацыях, якія сістэматычна паўтараюцца. Да сённяшняга дня дайшоў водгаласак старажытнага веравання пра бусла, пра яго вяртанне на Дабравесце. Адным з радасных і доўгачаканых святаў у дзяцейбылі Саракі. Іушканне на арэлях лічылася абавязковым, бо ў народным разуменні гэта станоўча ўплывае на здароўе. Дзеці далучаліся да шэсця моладзі з лялькамі і пераапраналіся ў розных звяроў, што суправаджалася жартамі, песнямі. У народным уяўленні гэта суадносілася з верай, што пэўныя дзеянні малых могуць аказаць уплыў на сілы і з'явы прыроды (выклікаць дождж, павітаць дружную вясну). Магічныя дзеянні, якія выконвалі дзеці на Каляды, Купалле, спрыялі дабрабыту сям'і.

Сёння далучэнне дзяцей да вытокаў народнай культуры немагчыма без паслядоўнай, мэтанакіраванай работы з бацькамі. Толькі тады, калі бацькі будуць зацікаўленыя, намаганні выхавальнікаў не знікнуць дарма. Выхавальнікі і бацькі мусяць быць аднадумцамі, а для гэтага неабходна спалучаць разнастайныя формы працы, якія б не прымушалі, а падштурхнулі да свядомага жадання арганізоўваць і праводзіць ранішнікі, забавы. Так, у нас падчас святаў бацькі

робяць элементы национальных касцюмаў, бабулі пякуць адпаведныя прысмакі, дзядулі рыхтуюцца да гульняў. Трэба адзначыць, што такія мерапрыемствы не абыходзяцца без удзелу іншых спецыялістаў дашкольнай установы: музычнага кіраўніка, кіраўніка фізічнага выхавання, шэф-повара. Бо фальклорнае свята ўключае ўсе жанры народнай творчасці: тэатральны, песенны, музычны, харэаграфічны. Ігрышча нагадвае спартыўную забаву, дзе хлопчыкі паказваюць свой спрыт, дужасць, хуткасць, цікавасць да спаборніцтваў з аднагодкамі ў выкананні фізічных практыкаванняў, а дзяўчынкі — вясёлыя скокі, уменне арганізаваць рухавыя гульні. Абмен народнымі стравамі на суполках-сходах старэйшым пакаленнем пасрпыяў падрыхтоўцы і выданню зборніка рэцэптаў «Традыцыйна беларускія стравы ад продкаў да нашых дзён». Так, на Кірмаш і Багач назапашвалі арэхі, пяклі здобу з новага ўраджаю. На Каляды рыхтавалі пачастункі — яблыкі печаныя, святочную куццю з круп; бліны, куханы — на Масленіцу; на Вялікдзень — куліч. Дзеці ўсіх узростаў па традыцыі наведвалі ў гэты дзень сваіх хросных бацькоў ад якіх яны чакалі падарункаў і пачастункаў. Увогуле дарыць адно аднаму яйкі — даўні звычай. Так падтрымлівалася сувязь паміж пакаленнямі — не толькі блізкімі, але і далёкімі. Вясной выпякалі коржыкі — галепы (піражок у выглядзе бусла), посныю булкі (40 жаваранкаў з цеста).

Вельмі карысныя, на наш погляд, сучасныя святы: Дзень смеху і жартаў (I красавіка); Дзень сталых людзей (1 кастрычніка); Дзень Маці (14 кастрычніка); Дзень сям'і (15 мая).

Неабходна імкнуцца, каб уся работа з дзецьмі прыносіла радасць. У беларускай народнай педагогіцы існуе асаблівая з'ява, якая ўзмацняе выхаваўчы ўплыў народных гульняў на дзяцей. Сям'я патрабавала павагі да гульняў дзяцей з доўгажыхарамі (але каб чужыя людзі не ўбачыпі дзіцячыя гульні старых). Дзеці ж, што гулялі з імі, рана прывучаліся да міласэрнасці, павагі да старасці і, паводле павер'я, павінны былі жыць доўга і ў свой час гуляць са сваімі нашчадкамі. На літаратурных канцэртах («Усе мы з бабуліных, дзядулевых далоняў» і інш.), фальклорных святах, забавах па гэтым прынцыпе арганізавалі сустрэчы малых са старэйшымі членамі сям'і. Дзеці на іх прыкладзе віталіся ў гульнях, замацоўвалі элементарныя правілы народнага этыкету. Вобразныя словы і выразы не толькі ажыўлялі мову, але і адлюстроўвалі духоўнае багацце народа, яго розум, іронію, назіральнасць і глыбокае разумение чалавечых узаемаадносінаў.

Галоўным у нашых сумесных мерапрыемствах з'яўляецца рэалізацыя задач: узбагачаць і паглыбляць эмацыянальныя сувязі паміж членамі сям'і; развіваць пачуццё салідарнасці з роднымі і блізкімі; фарміраваць жаданне і ўменне аказваць эмацыянальную падтрымку эмацыянальнае адчуванне ў сям'і.

І як вынік была складзена праграма супрацоўніцтва з сям'ёй па пытаннях этнапедагогікі аб традыцыйным выхаванні дзяцей беларусаў *(гл. табліцу).*

*Табліца*

| **Месяц** | **Мерапрыемства** | **Праграмны змест** | **Адказны** |
|---|---|---|---|

| | | | |
|---|---|---|---|
| Верасень | Ф. Скарына. «Птушкі ведаюць гнёзды свае» (анкетаванне бацькоў) | Праблемы і спецыфіка выкарыстання лепшых узораў народнай педагогікі ў выхаванні дзяцей у сям'і | Загадчык |
| Кастрычнік | «Фальклор—душа народа» (бацькоўскія сходы) | Традыцыі культуры выхаваннядзяцейбеларусаў праз фальклор: забаўлянкі, калыханкі, замовы | Выхавальнік |
| **Месяц** | **Мерапрыемства** | **Праграмны змест** | **Адказны** |
| Лістапад | «Усе мы з бабуліных, дзядулевых далоняў» (літаратурны канцэрт) | Шанаванне і павага да старэйшых, клопат аб бабулях і дзядулях як важнейшы пастулат гуманізму, міласэрнасці | Музычныкіраўнік |
| Снежань | «Сённяў нашай хаце свята» (вячоркі) | Рэкамендацыі бацькам, як арганізаваць свята ў сям'і з дапамогай беларускай народнай творчасці | Педагог-псіхолаг |
| Студзень | «Каляда-калядзіца» (свята з удзелам бацькоў фуп «Фантазёры») | Адметнасці святкавання Калядаў на Беларусі, канкрэтныя парады па святкаванні ў сям'і (народныя гульні, калядныя песні) | Музычны кіраўнік |
| Люты | «Як выхаваць беларуса» (дыялог за круглымсталом) | Уяўленне аб сямейна-побытавай маралі беларусаў, спалучэнне выхаваўчага вопыту мінулага з сучаснымі праблемамі | Адміністрацыя дашкольнай установы |
| Сакавік | «Прыляцелі птушкі...» (фізкультурная забава груп «Маляты», «Чамучкі») | Гульня як фактар паляпшэння мікраклімату сям'і | Кіраўнік фізічнага выхавання |
| Красавік | Пасяджэнне сямейнага клуба «Талака» | Адраджэнне традыцый беларускай нацыянальнай кухні. Прыгатаванне велікоднага стала | Бацькоўскі камітэт, шэф-повар |
| Май | «Дружна стане ў карагод наш славуты радавод» (абвяшчэнне пераможцаў конкурсу) | Падвядзенне вынікаў навучальнага года па распаўсюджванні лепшага сямейнага вопыту выхавання дзяцей праз беларускую педагогіку | Намеснік загадчыка па асноўнай дзейнасці |

# Калыханкі

**Мэты:** паведаміць бацькам аб значэнні калыханак для развіцця дзіцяці; пазнаёміць з традыцыйнымі формамі і метадамі сямейнага выхавання беларусаў у даўнія часы і на сучасным этапе; даць уяўленне пра тое, што калыханка садзейнічае фізічнаму развіццю, умацаванню здароўя, вастрыні слыху, музычнаму выхаванню, любові да роднага краю, роднай мовы і т.д.; спрыяць захаванню традыцый беларускай сям'і на сучасным этапе.

**Змест:**

уступнае слова выхавальніка абзначэнні калыханак для развіцця дзяцей;

даклад выхавальніка на тэму «Традыцыйнае выкарыстанне калыханак у беларускіх сем'ях як сродак выхавання дзіцяці».

**Удзельнікі:** выхавальнік, бацькі дзяцей фупы.

## Ход правядзення

**I.** Уступнае слова выхавальніка празначэнне кальтанкі для развіцця дзіця.

Паважаныя бацькі, сёння мы з вамі пагаворым аб беларускіх калыханках. Кожны з вас марыць аб тым, каб ваша дзіця вырасла ўдумлівым, кемлівым, каб у далейшым змагло заняць належнае месца ў жыцці грамадства, любіла родную мову, прыроду было паважаным чалавекам. Таму неабходна з маленства вучыць дзяцей, часцей пець ім калыханкі.

Беларускі гісторык і этнограф Павел Баброўскі пісаў: «Беларуси, не ведаючы таго, што яны беларусы, захавалі і ў штодзённай мове, і ў песнях, і ў прыказках свае пэўныя, нацыянальныя, лагічныя формы, свой звычай... Здзяйсняючы ўсе свае хрысціянскія абрады быццам бы несвядома, беларус, ці то праваслаўны, ці каталік, мае сваё перакананне, сваю маральную філасофію, і перадае ўсё гэта разам з мовай сваім дзецям і ўнукам». Трэба, каб дзіця выкарыстоўвала калыханку ў гульні, бо ні да якой дзейнасці яно не праяўляе столькі цікавасці, колькі да гульнявой. Ключавыя яе паняцці: «інтарэс», «задавальненне», «развіццё».

**II.** Выступление выхавальніка на тэму «Традыцыйнае выкарыстанне калыханак у беларускіх сем'ях як сродак выхавання дзяцей».

Народная педагогіка беларусаў была педагогікай жыцця. Выхаваўчая практыка на працягу многіх стагоддзяў пачыналася з калыскі і цесна звязвалася з рэчаіснасцю, з побытамі гаспадарчай дзейнасцю народа, абапіралася на яго жыццёвыя прынцыпы. Найбольш цікавыя і карысныя звесткі па народнай педагогіцы беларусаў мы знаходзім у вуснай народнай творчасці, звычаях, абрадах, дзіцячых гульнях.

Менавіта з фальклорных твораў дзеці атрымлівалі простыя і разам з тым найбольш важныя для жыцця веды аб з'явах прыроды, узаемаадносінах чалавека з навакольным светам, паміж блізкімі (у сям'і), суседзямі і г.д. Народная творчасць змяшчае ў сабе павучанні, назіранні, вучыць любіць працу і працаўніка, цаніць усё, што здабываецца працай, і захоўваць навакольнае

асяроддзе, выхоўвае павагу да зямлі. Педагагічныя ідэі, закладзеныя ў кожным творы, развіваюць вынаходлівасць, уменне пераадольваць цяжкасці.

Яшчэ ў маленстве маці, бабуля або старэйшыя брат ці сястра вучылі дзяцейнескладаным песенькам. Каб яны хутчэй пачалі размаўляць, прапаноўвалі шмат цікавых і вясёлых вершаў, скорагаворак, дражнілак, лічылак

Для традыцыйнай народнай педагогікі характэрна «школа пешчання», якой надаецца вялікае значэнне, бо яна пэўным чынам уплывае на фізічнае і псіхічнае здароўе дзіцяці,удасканальвае вобразнае мысленне і з'яўляецца першай школай музычнай адукацыі. Галоўны яе момант — *закалыхванне.* У беларусаў здаўна склалася багацейшая песенная культура з вялікай разнастайнасцю калыханак, якія добра ведала кожная сялянка дзякуючы трансмісіі народнага вопыту з пакалення ў пакаленне. Традыцыйныя навыкі закалыхвання набываліся з дзяцінства, калі маленькая нянька спявала пачутыя ад маці ці бабулі калыханкавыя песні (у ролі нянькі было амаль кожнае сялянскае дзіця).

Рэпертуар калыханак залежаў ад здароўя дзіцяці, яго сацыяльнага статусу (сялянскае, местачковае, баярскае, незаконнанароджанае, казеннае), а таксама ад узросту і настрою нянькі, яе ўмення спяваць, ад ведання пэўнай колькасці калыханак,

Спявалі калыханкі не толькі для таго, каб заспакоіць, закалыхаць дзіця да сну і зберагчы такім чынам яго фізічнае і псіхічнае здароўе, але і вызваліць пэўную частку часу для працы і адпачынку. Перш чым пець калыханку, трэба было даць немаўляці грудзі ці цёплае малако (зрэдку з макам), соску (сусолку), а потым, гойдаючы калыску, маці ці нянька ў рытм ёй спявала песні. Гукавы рад калыханак утрымліваў заспакойваючыя гукі, што паўтараліся і садзейнічалі хуткаму засынанню. Для капрызных дзяцей нянька спявала калыханкі, у якіх прысутнічалі страшныя персанажы накшталт Бабы Ягі, Зюзі і інш. У калыханкавых песнях, заспакойваючых, закалых-ваючых, маці праўдзіва і шчыра спявае аб радасці і горы, аб будучыні дзіцяці — шчаслівым і радасным. У песнях маці жадае дзіцяці здароўя, дабрабыту, шчасця, долі, спявае пра тое, як яно вырасце і будзе для бацькоў радасцю і ўцехай, а таксама абаронцам сваякоў і людзей увогуле.

Калыханкі знаёмілі дзіця з навакольным светам, вучылі любіць хатніх жывёл. Тут і коцік — першы аб'ект назіранняў дзіцяці і паўнаўладны жыхар кожнага сялянскага дома. Ён малюецца як істота, што клапоціцца пра маленькіх: прыносіць піражок, булку, можа закалыхаць дзіця і г.д. Акрамя таго, калыханкі пра коціка ўтрымлівалі элементы маралі і былі павучальнымі — яркімі фарбамі малявалі вынікі дрэнных учынкаў і супрацьпастаўлялі ім дабрачыннасцы

Пайшоў каток на таржок,
Купіў сабе піражок
І сеў на калодзе
Удобрай выгодзе,
І табачкі занюхаў,
І добрых людзей паслухаў.

У беларусаў, як і ў многіх іншых народаў крадзёж лічыўся адной з

самых страшных заганаў. І перасцярога ад яго, навучанне сумленнасці пачыналася з самага ранняга ўзросту. Ужо ў калыханках маці расказвала дзецям, што чалавек, які бярэ чужое, дрэнны і асуджаны на ўсеагульную пагарду. Тое ж адносіцца да лянівага, нядоай-нага чалавека. Такім чынам, дзякуючы калыханкам дзіця спасцігае асновы маральнага кодэксу селяніна. Рэпертуар песень маці ўскладняецца паступова. У іх з'яўляюцца вобразы розных жывёл, якіх дзіця, падрастаючы, назірае ў двары, у полі, на лузе, у лесе. Тут і голуб — сімвал прыгожага, узвышанага, куры і кураняты з іх звычкамі, казёл, воўк, сарока іг.д. Знаёмства з навакольным асяроддзем адбшалася ад простага да складанага, ад блізкага да больш далёкага. Пры гэтым маці тлумачыла незразумелае і замацоўвала ў свядомасці дзіцяці элементарныя веды.

Вялікае месца ў выхаванні дзіцяці адыгрывала *калыска* — яго дом. На ўсё жыццё ў чалавека застаюцца прыемныя ўспаміны пра яе. У калыханках ствараўся цудоўны вобраз немаўляці, што спачывае ў калысцы і якога ахоўваюць сон, дрымота — лепшыя памочнікі маці. І для іх яна не шкадуе фарбаў. У народнай творчасці яны маляваліся ў выглядзе чалавека падобных істотаў, што ахоўваюць, закалыхваюць дзяцей.

У калыханках малююцца ідэалы народа, яго патрэбнасць у шчасці, дастатку, якое магчыма было толькі ў мары. Зведаўшы ў асабістым жыцці цяжар нястачы, маці ў калыханцы жадае свайму дзіцяці ўсяго найлегапага. У калыханках шмат любові, пяшчоты, жыццёвай праўды. У цэлым яны ўяўляюць з сябе філасофію сялянскага жыцця.

У засваенні духоўных каштоўнасцей велізарную ролю адыгрываларódнаямова, штоз першых дзён гучала ў хаце. Дзіця з калыскі вучылася роднаму слову праз калыханкі, забаўлянкі, пяшчотныя словы маці і, урэшце, ад усіх членаў сям'і. Менавіта праз родную мову з пакаленняў пакаленнеперадаваліся духоўныя набыткі.

Музычнае выхаванне, у працэсе якога дзеці вучыліся адчуваць пры-гажосць народных напеваў, спяваць, пачыналася з ранняга дзяцінства. Першае знаёмства з музыкай і песняй адбывалася праз калыханкі. З узростам яно становіцца болын разнастайным. Дзеці слухаюць спевы маці і іншых у час хатняй працы (за кудзеляй, за кроснамі), а таксама ў святочныя дні, на каляндарных і сямейных святах, у якіх і самі прымаюць удзел.

**III.** Выхавальнікі прапануюць бацькам успомніць беларускія калыханкі, якія яны ведаюць ці выкарыстоўваюць у гульнях з дзецьмі.

Народная педагогіка беларусаў як гістарычна абгрунтаваная сістэма была асновай выхавання і мела глыбокія і трывалыя карані. З пакалення ў пакаленне назапашваліся, шліфаваліся і перадаваліся розныя веды, працоўныя навыкі і гл, Назапашванне практычна-ўтылітарнага і духоўнага вопыту, неабходнае для сацыяльна-культурнай адаптацыі кожнага новага пакалення, ішло праз фальклор, народныя святы і абрады, гульні і іншае, дзе кожны — і ўдзельнік, і творца. Педагагічны геній народа выяўляўся ў тым, што ўсе выхоўваючыя моманты арганічна ўпляталіся ва ўсе сферы чалавечых адносінаў. (Сучасны тып

выхавання нярэдка называюць «выхаваннем па тэлефоне», калі парады і наказы бацькоў даюцца галоўным чынам менавіта такім спосабам)

Выхавальнікі прапануюць бацькам завучыць хоць адну з калыханак

Люляю-люляю,
Я коціка налаю,
Каб ён да нас не хадзіў,
Цябе, дзетка, не збудзіў.
А ты, каток, пайшоў вон,
А дзетачцы аддай сон.

Ходзіць сон каля вакон,
А дрымота каля плоту.
І пытае сон дрымоту:
Дзе мы будзем начаваць?
Дзе хацінка цяпленька,
Дзе хацінка маленька.

Люлі-люлі, люляшу,
Я дзіцятка калышу.
Нітачку звіваю,
Песеньку спяваю.
Што выведу нітачку —
Камару на світачку
Застануцца кончыкі
Камару на штончыкі.
Ай, люлі-люлі-люлечкі,
Прыляцелі гулечкі,
Сталі яны буркаваць:
Чым дзіцятка гадаваць?
Пакарміце малачком,
Саладзенькім піражком,

А ты, коцінька-каток,
У цябе шэранькі хвасток
Ты прыходзь к нам начаваць,
Будзеш (Янку) калыхаць,
А я шэраму катку
За работу заплачу —
Дам гарлачыкмалака
І кавалак пірага.

Бацькам даецца маляўнічы канверт, у якім знаходзяцца карткі з практичным заданием, Удзельнікі сходу бяруць картку з канверта, чытаюць задание і выконваюць яго. Гэтак яны набываюць навыкі выкарыстання калыханкі ў гульні са сваім дзіцём.

**VI.** У якасці рашэння бацькоўскага сходу разглядаюць калыханку як першую прыступку ў садзейнасці правільнаму фізічнаму і псіхічнаму развіццю, вобразнаму мысленню, музычнай адукацыі, любові да роднай мовы, роднага краю, як элемент «школы пешчання».

**V.** Хвілінка ўдзячнасці: выхавальнік дзякуе бацькам за поспехі ў выхаванні дзяцей, ухваляе тых, хто прымаў актыўны ўдзел на сходзе.

## Забаўлянкі

**Мэты:** паведаміць бацькам аб значэнні сумесных гульняў у сям'і для развіцця дзіцяці; пазнаёміць з традыцыямі і формамі гульнявога выхавання дзяцей у беларускіх сем'ях у даўнія часы і на сучасным этапе; даць уяўленне пра тое, што гульні (забаўляній) садзейнічаюць фізічнаму развіццю, назіральнасці, кемлівасці, удумлівасці, знаходлівасці, вытрымцы, калектывізму, развіццю клопату аб іншых, любові да роднага краю, пачуцця справядлівасці, прыгажосці і гд.; спрыяюць захаванню традыцый беларускай сям'і на сучасным этапе.

**Змест:**

уступнае слова выхавальніка пра значэнне і выкарыстанне традыцый-ных беларускіх гульняў як сродку выхавання дзіцяці;

даклад выхавальніка на тэму «Традыцыйнае выкарыстанне забаўлянак у беларускіх сем'ях як сродак выхавання дзіцяці».

**Удзельнікі:** выхавальнікі, бацькі дзяцей групы.

**Ход правядзення**

I. Уступнае слова выхавальніка пра выкарыстанне традыцыйных беларускіх гульняў у выхаванні. Асвятляюцца беларускія забаўлянкі.

Гэта тэма выбрана невыпадкова. Усе мы жадаем, каб дзеці выраслі самастойнымі, патрэбнымі грамадству. Антон Макаранка казаў: «Якое дзіця ў гульні, такім яно будзе ў працы, калі стане дарослым«. Таму заўсёды падкрэсліваецца, што гульня — справа сур'ёзная. Словы «інтарэс», «задавальненне», «развіццё»— гэта ключавыя паняцці гульнёвай дзейнасці. Яму цікава ў ёй, а гэта азначае, што спазнанне і развіццё адбываецца лёгка, з задавальненнем. Вось у чым сакрэт выхаваўчых магчымасцей гульні. Яны развіваюць спазнавальныя працэсы асобы — увагу, памяць, успрыманне, уяўленне, мысленне і трэніруюць назіральнасць і розум, развіваюць творчыя здольнасці дзяцей, садзейнічаюць спазнанню самога сабе і падахвочваюць да самаўдасканалення.

**II.** Выхавальнікі прапануюць бацькам успомніць беларускія забаўлянкі, якія яны ведаюць ці выкарыстоўваюць у гульнях з дзецьмі.

III. Выступление выхавальніка на тэму «Традыцыйнае выкарыстанне забаўлянак у беларускіх сем'ях як сродак выхавання дзіцяці».

У беларусаў была своеасаблівая «школа пешчання». Немаўлятак забаўлялі, прывучалі да простых гульняў з дапамогай забаўлянак, якіх багата мелася ў народнай творчасці. Так, падкідвалі дзіця на руках, пахлопвалі яго па плечыках, пагладжвалі па жывоціку, згіналі і выпрамлялі ручкі і ножкі — гэтак рабілі гімнастыку дзіцяці і суправаджалі яе спецыяльнымі забаўлянкамі, як імправізаванымі, так і ўсім вядомымі ў той ці іншай мясцовасці.

Крыху пазней маці ці нянька, трымаючы голую ручку дзіцяці ўверх далоняй, вадзіла па ёй пальцамі і спявала:

— Ласачка, ласачка,
Дзе была?
— У Бога была.

— Што рабіла?

— Кроены ткала.

— Што саткала?

— Кавалак сала.

Потым, узяўшы дзіця нарукі, спачатку сама ціхенька пляскала дзіцячымі далонямі і прыпявала:

— Лады-лалы-ладкі,
Дзе былі? — У бабкі!
— Што елі? — Кашку.
— Што пілі? — Малачко.
Кашку паелі, Малачко папілі,
На галоўку селі,
Пырх — і паляцелі.

На апошніх словах выказвання маці ўзнімала ручкі дзіцяці ўгору, дакраналася да галоўкі і пачынала махаць яго ручкамі, імітуючы палёт птушак Такія забаўлянкі выклікалі захапленне і смех дзіця, былі забавай і своеасаблівай гімнастыкай.

Забаўлянкі тыпу «Сарока-варона» мелі шмат варыянтаў і былі добра вядомыя кожнаму дзіцяці. Звычайна ўпершыню іх чулі ад маці, старэйшай сястры або бабулі, пазней дзіця само спрабавала пляскаць у далоні пры першых словах забаўлянкі:

Сарока-варона
Кашку варыла,
Дзетак карміла:
Гэтаму давала,
Гэтаму давала,
Гэтаму давала,
Гэтаму давала.
А ты, пальчык
Маленькі пальчык,
Схадзі па вадзіцу
У сцюдзёну крыніцу...

Далей маці дакраналася да розных месцаў на руцэ дзіцяці, пачынаючы з кісці, і прыгаворвала: крыніца,сцюдзёна вадзіца. А потым асцярожна казытала маленькага, які стараўся ўхіліцца і смяяўся. Трэба сказаць, што гэтыя забаўлянкі даволі шырока бытуюць як у вёсцы, так і ў горадзе, і іх расказваюць, каб суцешыць ці забавіць дзіця, узняць настрой.

Захаваліся да нашых дзён і наступныя забаўлянкі. Загнуўшы сярэднія пальцы рукі і выцягнуўшы ўперад указальны і мізінец у выглядзе рожак (імітуючы казу), дарослы спяваў:

Ішлі козы рагатыя, бадатыя:
— Каго пападу, таго забаду!
Аксютку папалі,
Аксютку забадалі:

Будык-будык-будыкі!

З апошнімі словамі казыталі дзіця (нядоўга), а яно смяялася. З забаўлянкі маленькае спазнавала, што каза можа «забадаць».

Забаўляючы дзіця, клалі яго на жывоцік, спінку, пагладжвалі і спявалі. Прыемны матыў песні, а таксама лёгкі масаж спіны, жывата, ручак або ножак супакойліва ўздзейнічалі на дзіця. Цяпер мы добра ведаем пра дзеянне кропкавага масажу. У народзе здаўна інтуітыўна карысталіся ім. Так, узяўшы ножку дзіцяці, ціхенька стукалі пальцам па ступні спачатку адной, затым другой нагі, прыгаворваючы:

Кую, кую ножку,
Паедуўдарожку,
Куплю чаравічкі,
Малы, невялічкі,
На Валюшкіну ножку.
Кую, кую другую,
Паедуў другую.
Дарожка — доўгая,
А ножка — малая.

Простыя практыкаванні, якія выконваліся з дапамогай дарослых, развівалі рухі дзіцяці. Вельмі распаўсюджаным было гушканне дзіцяці на руках і на нагах пад напеў спецыяльных забаўлянак (і з імправізацыямі). Пасадзіўшы яго на калені, спявалі:

Чук-чук-чук
Налавіўдзедшчук,
А баба — плотак
Ды пазвала цётак

Пры гэтым дзіця злёгку падкідвалі і пагойдвалі. У імправізаваных забаўлянках, якія заканчваліся словамі «Гук, яма!», калені рассоўваліся, дзіця падала, і тут жа яго падхоплівалі. Вельмі падабаліся маленькім гушканні на нагах: дзіця садзілася або лажылася на ногі, якія падымалі і апускалі долу.

Вучылі дзіця хадзіць, трымаць раўнавагу водзячы па лаўцы і прыгаворваючы: «Топ, топ...»

Вельмі падабаліся маленькім і просценькія гульні, адной з якіх была «Дзіравыя гаршкі». Любілі яе праводзіць з малятамі старэйшыя дзеці. Пасадзіўшы дзіця сабе на плечы, скакалі з ім па хаце і прыгаворвалі: «Прадаюцца дзіравыя гаршкі!» або «Гаршкі, гаршкі дзіравыя!». Прысутныя ціхенька пляскалі пры гэтым малога па спіне, чым прыносілі вялікае задавальненне дзіцяці, якое станавілася аб'ектам усеагульнай увагі.

Забаўлялі дзяцей і з дапамогай танцаў і жартоўных песень. Вучылі першым гукам, імітуючы хатніх жывёл і птушак «мяў», «гаў», «ку-ка-рэ-э-ку» і пд., а таксама добраму стаўленню да іх. Прысловах «коця харошы!» гладзілі ката спачатку сваёй рукой, а потым рукой дзіцяці. Са словамі «харошы» гладзілі па галаве, спіне ці руцэ маці, бацьку сястру браціка. Нярэдка казалі пры гэтым: «Абдымі ці пацалуй тату браціка...» або пыталіся ў маленькага: «Пакажы, як ты

любіш брацікa», і ён імкнуўся абняць ручкамі або пагладзіць. Дзеці атрымлівалі такім чынам першыя ўяўленні аб добрых адносінах, пяшчоце, любові. Акрамя таго, знаёміліся з жывёламі і птушкамі, пачыналі разумець месца і ролю кожнага з іх у жыцці і быце людзей.

**IV.** «Канверт сяброўскіх пытан-няў».

Бацькампрапануецца маляўнічы канверт, уякім знаходзяцца карткі з пытаннямі. Па жаданні ўдзельнікі сходу бяруць картку з канверта, чытаюць пытанне і адказваюць на яго.

**Прыкладныя пытанні на карт-ках:**

1. Якія беларускія забаўлянкі вы ведаеце?

2. Ці часта вы выкарыстоўваеце забаўлянкі ў гульнях з дзецьмі?

3. Як быць, калі ўсялякая няўдача ў гульні выклікае ў дзіцяці прыгнечаны настрой або слёзы?

**V.** Заключны этап. Бацькам уручаюцца памяткі з наступнымі парадамі:

1. Мэтазгодна пачынаць гуляць з самых простых гульняў, паступова ўскладняць гульнёвыя заданні І не спяшацца пераходзіць да больш складаных.

2. Не трэба развучваць адразу вельмі многа гульняў таму што дзіця павінна «нагуляцца» з адным відам.

3. Неабходна падтрымліваць дзяцей за поспехі ў гульні — словам, пах-валой, адзнакамі, баламі, прызавымі месцамі і гд.

4. Трэбапрывучаць дзяцей захоўваць гульнявыя прадметы акуратна, у спецыяльна вызначаных для іх месцах.

Выхавальнік зачытвае тэкст памяткі, які разглядаецца ў якасці рашэння бацькоўскага сходу.

**VI.** Хвілінка ўдзячнасці. Выхавальнік дзякуе бацькам за поспехі ў выхаванні дзяцей, адзначае тых, хто прымаў актыўны ўдзел і дзяліўся сваім вопытам сямейнага выхавання.

# Пакаранне як сродак выхавання дзяцей

**Мэты:** вызначыць уяўленні бацькоў аб праблемах, шляхах, формах і спосабах садзейнічання развіццю асобы дзіцяці; пазнаёміць бацькоў з традыцыямі і спосабамі выхавання ў беларускай сям'і, з асновай народнай педагогікі беларусаў наогул; садзейнічаць яднанню бацькоўскага калектыву групы; садзейнічаць фарміраванню добразычлівых і даверлівых адносінаў паміж выхавальнікамі і бацькамі; дамовіцца аб шляхах, сродках і прыёмах стварэння гуманных узаемаадносінаў з дзецьмі ў сям'і.

**Падрыхтоўка:** выхавальнік знаёміцца з навукова-метадычнай літаратурай па пытанні асноў народнай педагогікі беларусаў і спосабах выхавання дзяцей, праводзіць індывідуальныя гутаркі з бацькамі, знаёмячыся з метадамі выхавання ў сям'і.

**Ход правядзення**

**I.** Выхавальнік расказвае пра актуальнасць вырашэння праблемы жорсткасці і неабходнасці пошуку альтэрнатыўных метадаў выхавання, знаёміць з асновамі народнай педагогікі ў беларускай сям'і.

**II.** Калектыўнае абмеркаванне пытанняў:

За што і чаму бацькі зневажаюць і караюць дзяцей?

Якія вынікі фізічнага і псіхічнага насілля над дзецьмі?

Як абысціся без зневажальных пакаранняў?

Калі даводзіцца караць, то як?

**III.**Выхавальнік знаёміць з каталогам эфектаў, якія ўздзейнічаюць на развіццё асобы дзіцяці тыповымі спосабамі камунікацыі бацькоў з дзецьмі.

**IV.** Абмеркаванне рашэння бацькоўскага сходу ў форме рэка-мендацый бацькам.

**V.** Правядзенне анкетавання бацькоў.

У АСНОВЕ народнай педагогікі беларусаў былі даволі складаныя адносіны бацькоў да дзяцей, што лічылася не процівагай бацькоўскай любві, а, наадварот, яе доказам. Да нашых дзён захавалася перакананне, што любіць дзяцей трэба ў душы, не паказваючы свае пачуцці, бо інакш працэс выхавання не будзе мець добрых вынікаў. Звычайна кіраваліся нормай: *«Любі дзіцяў душы, але віду не паказвай».*

Да маленькіх дзяцей бацькі адносіліся асабліва ўважліва і пяшчотна. Іх акружалі любоўю і ласкай. Лічылі неабходным даць тую рэч або цацку якую патрабаваў маленькі, калі ён плакаў. Задавальняючы патрэбы маленькіх, з разумением адносячыся да іх свавольстваў, разам з тым не стваралі для іх штучных умоў. Ведалі, што трэба загартоўваць дзяцей, выхоўваць больш прыстасаванымі да жыцця, вучыць цярпліва пераносіць боль і іншыя выпрабаванні.

Народная педагогіка з упэўненасцю сцвярджае, што дзеці павінны выхоўвацца і расці ў сям'і, бо толькі ў сям'і найлепшыя для гэтага ўмовы: *«Без маці, без айца блукаецца, як аўца».* Уклад сям'і ўплывае на развіццё як чалавека, так і прыроды ўвогуле. Птушка вырошчвае птушанятаў, звер — зверанятаў,

расліна дае жыццё парасткам, і гэтак усё ў прыродзе знаходзіцца ў згодзе і гармоніі.

У кожнага народа на працягу многіх стагоддзяў скалаліся свае сацыяльна-маральныя ідэалы і нарматыўныя ўяўленні пра выхаванне дзяцей і адпаведную выхаваўчую практыку. Традыцыйныя нормы, якія рэгламентуюць стаўленне дарослых да дзяцей, маюць «д'ваісты» характар, бо яны, з аднаго боку прадпісваюць вельмі клапатлівыя, спагадлівыя адносіны дарослых да дзяцей і асуджаюць жорсткасць ці грубасць, з другога — выказваюць даволі нізкую сацыяльную каштоўнасць шасці-сямігадовых дзяцей.

Строгасць і патрабавальнасць да дзяцей была традыцыйнай нормай беларусаў. У працэсе выхавання дзяцей амаль у кожнай сям'і выкарыстоўваўся такі сродак, як *фізічнае пакаранне.* Аднак перавагу мелі маральнае асуджэнне, *вымова* або*пагроза.* Пакаранне папругай, дубцом, пугай было ў асноўным надзвычайнай мерай. Асцерагаліся біць па галаве, па жываце, а таксама цяжкімі прадметамі, каб не пакалечыць дзіця.

У народзе лічылася, што лупцоўка павінна быць адчувальнай, але не шкоднай. Нават у межах адной сям'і не да кожнага дзіцяці прымянялася фізічнае пакаранне, бо аднаму з іх дастаткова было пагразіць, зрабіць заўвагу, і гарэзнік супакойваўся, а другога мог спыніць толькі дубец *(«Адно дзіця баіцца ківа, а другое кія»).* Гэта якраз пацвярджае індывідуальны падыход у выхаванні дзяцей, калі ўлічваюцца іх характар, узрост, фізічнае і эмацыянальнае развіццё.

Так, калі здараліся бойкі паміж дзецьмі і бацькі высвятлялі, што сын «даваў здачу» або абараняў сястру ці каго іншага, то яны абыходзіліся заўвагай. Калі ж, наадварот, ён быў зачыншчыкам, агрэсіўна сябе паводзіў то яго чакала пакаранне, у тым ліку і фізічнае.

Да спрэчак і боек дзяцей бацькі адносіліся парознаму. У народнай творчасці сустракаецца выраз *«Дзетачкі ў лясачкі, матачкі ў сварачкі»,* што азначае ўмешванне дарослых ва ўзаемаадносіны дзяцей. І сапраўды, гэта нярэдка было прычынай канфліктных сітуацый паміж суседзямі. Але быў і іншы падыход да вырашэння гэтай праблемы. Так, на скаргі дзяцей на тое, што хтосьці іх адлупіў ці пакрыўдзіў, бацькі адказвалі, што не трэба гуляць з ім, забаранялі хадзіць да іх і пд.

Увогуле скардзіцца бацькам лічылася непрыстойным, і да скаргаў прыбягалі толькі маленькія. У народзе лічылася, што непаразуменні паміж малымі натуральныя і часовыя («пабіліся — памірыліся»), таму звярталі ўвагу толькі тады, калі здаралася што-небудзь сур'ёзнае.

Разам з тым практыка народа ўтрымлівала і іншыя метады выхавання, такія як *напамінак* і *прывучанне* да пэўных звычак, паводзінаў з мэтай іх замацавання, *метод пераканання* ў неабходнасці выканання таго або іншага дзеяння, а таксама розныя метады і прыёмы выкаранення шкодных звычак, непажаданых праяваў (пазбаўленне забаў, ласункаў, адлучэнне ад грамады аднагодкаў і інш.). Немалаважнае месца сярод іх займала выкліканне агіды да чалавечых заганаў, такіх як крадзёж, п'янства, гультайства і інш.

Асаблівую ролю ў выхаванні выконвала маці. Можна з упэўненасцю сцвярджаць, што пяшчотная любоў маці да сваіх дзяцей — характэрная рыса адносінаўу сям'і беларусаў. Сэрца маці заўсёды баліць аб дзецях, аб іх усе яе думкі і клопаты. Маці ніколі не бывае жорсткай з дзецьмі, нават калі злуецца ці сварыцца.

Трэба сказаць, што народная мараль асуджае рэзкасць і жорсткасць ва ўзаемаадносінах бацькоў і дзяцей. І тут таксама прытрымліваліся прынцыпаў гуманізму і адпаведнасці прыродзе ў выхаванні. Жорсткасць можа зламаць дзіця. У народзе кажуць: *«Як не загнеш молодое дубінкі, тоякустарэе — пераломіццш, «Не бі сабаку кіем, бо ён яшчэ больш брахаць будзе», «Не біце вяроўкамі, навучайце гаворкамі».*

Строгасць і патрабавальнасць да дзяцей былі традыцыйнай нормай беларусаў.

Каб прывіць дзецям агульнапрынятыя маральныя нормы, ім з маленства расказвалі розныя гісторыі з жыцця знаёмых і незнаемых людзей, з якімі здаралася няшчасце, бо яны ў сваіх паводзінах не падпарадкоўваліся гэтым абавязковым правілам. Непаслухмяных запалохвалі пакараннем неба.

За моладдзю існаваў нагляд з боку старэйшых. У адрозненні ад сучаснасці, дзеці вельмі лічыліся з жаданнямі і звычкамі старэйшых.

Згодна з выхаваўчым ідэалам беларусы імкнуліся развіць у дзяцей працавітасць, сумленнасць, дабрыню, фізічную загартаванасць. Гэтаму садзейнічала народная мудрасць.

Выхаваўчая практыка абапіралася на высокі аўтарытэт бацькоў, дысцыпліну, строгае выкананне правілаў і нормаў паводзінаў у сям'і і грамадстве, глыбокай павазе дзяцей да бацькоў і дарослых.